**Жылко У.А.**

# РЭАЛІСТЫЧНАЯ ПАРАДЫГМА САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧ. XX СТ.

Другая палова XIX – пачатак XX ст. у беларускай культуры характарызуецца ўскладненасцю сацыяльнай і культурнай сітуацыі і ў той жа час адыгрывае вызначальную ролю ў культуратворчым працэсе. Супярэчлівы характар сацыякультурнага развіцця акрэсленага перыяду найперш абумоўлены збегам гістарычных варункаў, які і з'яўляецца першапрычынай зменаў у культурным, палітычным і сацыяльным полі.

Усё вышэйакрэсленае дазваляе рязгледзець абраны перыяд ў дынаміцы – як працэс разгортвання айчыннай культуры ў часе і прасторы, а таксама ў непарыўнай сувязі з сацыяльнай арганізацыяй, сацыяльнымі пераменамі і ўзрушэннямі. Таму падаецца тэарэтычна апраўданым у якасці сістэмаўтваральнага ядра, прызмы аналізу другой паловы XIX – пачатку XX ст. абраць катэгорыю парадыгмы сацыякультурнага развіцця, паколькі для спасціжэння сутнасці культурнай эпохі неабходна ўлічваць узаемаабумоўленасць сацыяльных і культурных чыннікаў. Азначэнне паняцця парадыгма сацыякультурнага развіцця грамадства было сінтэзавана намі з канцэпцый Т. Куна [5], Н. Бакач [1] і заключаецца ў разуменні пад дадзеннай культуралагічнай катэгорыяй рэальнага феномену цэласнасці сацыякультурных адзінак у іх стылёвай сінхроннасці, у аснове якога палягае пэўны інтэгратыўны прынцып, істотны для культуры, разгледзенай на гарызантальным зрэзе, аднолькава прадстаўлены ва ўсіх адначасовых феноменах сацыякультурнай рэчаіснасці і адносна якога дадзеныя з'явы могуць быць растлумачаны як моманты адзінай культурнай цэласнасці. [1, с. 9].

Як вядома, у сярэдзіне XIX стагоддзя рамантызм пастулова выцясняецца рэалістычнымі тэндэнцыямі ў межах беларускай культурнай сітуацыі, што абумоўлена сацыяльнымі чыннікамі, якія фарміравалі яе пэўным чынам. У сферы сацыльна-палітычнага адносін другой паловы XIX

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ст. захоўваецца панаванне царскага абсалютысцкага рэжыму Расійскай імперыі. Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. адбываецца ўзмацненне рэпрэсіўнага пачатку, што выявілася ва ўзмацненні паліцэйска-бюракратычнага кантролю за палітычным жыццём на тэрыторыі Беларусі, паглыбленні палітыкі русіфікацыі ў розных сферах грамадскага жыцця. У сферы духоўнага жыцця назіралася ўмацаванне пануючага статусу праваслаўнай канфесіі ў сферы рэлігійных адносін, дыскрымінацыйная палітыка ў адносінах да каталіцкага насельніцтва. У той жа час назіралася развіццё форм нелегальнай рэвалюцыйнай субкультуры (друк, ліатратура). Варта адзначыць, што 50 – 60-я гг. – час найвышэйшага ўздыму вызваленчай барацьбы беларусаў супраць царызму. Менавіта ў дадзеных супярэчлівых гістарычных варунках выспела патрэба ў рэалістычным адлюстраванні рэчаіснасці, неабходнасці абвастрэння ўвагі да сацыяльных праблем і адпаведна крытыцы існуючых грамадска-палітычных парадкаў.

У станаўленні дадзенай культурнай парадыгмы ізноў жа прасочваюцца супярэчнасці як асноўны сродак зменаў у сацыякультуным развіцці. У якасці бадай што асноўнай супярэчнасці выступае супрацьстаянне рамантызму як форме адлюстравання рамантычнай парадыгмы з яго экзальтаванай ідэалізацыяй унутраных перажыванняў асобы, што ў сваю чаргу не надта спрыяла выкрыванню і вырашэнню ўсіх праблемных праяваў рэчаіснасці, бо не ўлічвала рэальных законаў грамадскага развіцця. Перад тагачаснымі людзьмі стала задача даследаваць жыццё з мэтай выяўлення аб’ектыўных заканамернасцей. Таму змена рамантычнай парадыгмы на рэалістычную ў беларускай культуры была цалкам заканамернай з’явай.

Варта адзначыць, што рэалізм як стылёвы накірунак адначасова выступае формай арганізацыі культурнай цэласнасці, спосабам самаідэнтыфікаці суб’ектаў парадыгмы сацыякультурнага развіцця грамадства. Рэалізм XIX ст. прынята называць у айчынных сацыягуманітарных навуках “крытычным рэалізмам”. У гэтым сэнсе тэрмін амаль што поўнасцю адпавядае свайму прызначэнню, паколькі рэалізм і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сапраўды паказвае пэўную неадпаведнасць тагачаснага грамадскага ладу нормам чалавечнасці, гуманістычнай маралі, крытычна аналізуючы і асэнсоўваючы ўсю сістэму грамадскіх адносін.

Калі звярнуцца да структурнай характарыстыкі парадыгмы крытычнага рэалізму, то ў межах светапогляднага складніка яе можна вылучыць імкненне да ўзнаўлення жыццёвай праўды, "жыцця ў формах самога жыцця", і ў межах гэтага адлюстраванне "тыповых характараў у тыповых абставінах", якія ў свой час гэты характар і фарміруюць. Паводле суб'ектаў рэалістычнай парадыгмы, у сапраўднай рэчаіснасці жыццё чалавека вызначаецца не толькі яго здольнасцямі, але і грамадскімі ўмовамі, пэўным чынам залежыць ад іх. Рэалісты сцвярджалі, што шчасце чалавека магчыма толькі тады, калі будзе свабодным увесь народ. Мастацтва рэалізму паказвае ўзаемадзеянне чалавека з асяроддзем, уздзеянне грамадскіх умоў на лёсы людзей, на іх духоўны свет і норавы. Сваю найважнейшую задачу рэалісты бачылі ў тым, каб узнавіць рэчаіснасць такою, якая яна ёсць, у пазнанні ўнутраных законаў гэтай рэчаіснасці, што вызначала яе дыялектыку і разнастайнасць форм [3, с. 73]. Менавіта дадзеная акалічнасць дыялектычнага адзінства і ўзаемаабумоўленасці грамадскай сферы і сферы жыцця асобнага чалавека была прадыктаваны складанымі гістарычнамі ўмовамі, якія па сутнасці вызначаюць каштоўнасны змест дадзенай сацыякультурнай парадыгмы.

Асноўнымі аксіялагічнымі складнікамі беларускага рэалізму другой паловы XIX ст. выступаюць мова, мінулае і гістарычны лёс народа, дзяржаўнасць, патрыятызм, Бацькаўшчына, а таксама такія рысы народнага характару, як працавітасць, абвостранае пачуццё справядлівасці, пачуццё ўласнай і нацыянальнай годнасці, спагадлівасць, руплівасць – усе рысы, уласцівыя прадстаўніку простага народа, селяніну, за правы якога і змагаліся беларускія рэалісты-творцы, выкрываючы і асуджаючы пасродках сваёй мастацкай спадчыны моманты сацыяльнай несправядлівасці.

Асноўную ўстаноўку пісьменнікі-рэалісты бачылі ў тым, каб не капіраваць рэчаіснасць, а выражаць яе. Як слушна зазначыў В. Каратынскі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва павінна быць праўдай, павінна змагацца за справу вечнажывой праўды, бо ў адваротным выпадку, як з’ява без мэты ці з часовай мэтай, яна зробіцца абыякавай для грамадства [4, с. 43].

Адпаведнасць мастацкіх вобразаў і сітуацый жыццёвай рэальнасці не азначае простага праўдападабенства і механічнага капіравання. У мастацтве рэалізму мастацкі вобраз выяўляе адзінаства вонкавага і ўнутранага, рэальна ўспрымаемага і сутнаснага, недасяжнага павярхоўнаму ўспрыманню. За канкрэтнай жыццёва вераголнай з’явай ці чалавечым лёсам, што ўвасабляецца ў парадыгмальным культурным тэксце, паўстае рэальнасць самога жыцця. Шматграннасць чалавечага быцця раскрываецца ў мастацкім творы праз сутыкненне характараў, праз выяўленне складанай гамы пачуццяў, душэўных драм – усяго таго, што складае жыццё чалавечага духу. Пры гэтым час і асяроддзе выступаюць істотным чыннікам станаўлення чалавечай асобы.

Дадзеныя парадыгмальныя адметнасці знайшлі сваё адлюстраванне ў культурных тэкстах, створаных суб’ектамі рэалістычнай парадыгмы. Рэалістычныя тэндэнцыі, якія назіраюцца ў літаратурнай творчасці, прасочваюцца ў творах В. Дуніна-Марцінкевіча (у п’есах “Пінская шляхта”, “Залёты”, дзе выкрываюцца хабарніцтва і самадуртсва чыноўнікаў). Найбольш паслядоўна рэалістычная парадыгма раскрываецца ў творчасці Ф. Багушэвіча, у якой амаль упершыню загучалі не толькі сацыяльныя матывы, але і матывы нацыянальнага адраджэння. Творчасць яго вызначаецца моцным крытычным пафасам. Мастацкія заваёвы Ф. Багушэвіча ў плане рэалістычнага адлюстравання жыцця пэўным чынам працягнулі і замацавалі Я. Лучына і А. Гурыновіч (у творах паэтаў, тым не менш, назіраецца ўзаемадзеянне рэалістычнага і рамантычнага пачаткаў). Рэалістычныя тэндэнцыі прасочваюцца ў асобных творах В. Каратынскага, А. Ельскага, Ф. Тапчэўскага. Так, напрыклад, найбольш яскрава эстэтычны ідэал В. Каратынскага як рэаліста раскрыўся ў паэме “Таміла”.

Рэалістычныя тэндэнцыі яскрава адлюстраваліся і ў выяўленчым мастацтве: мастакі ўсё часцей пачалі звяртацца да паказу жыцця народа, да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго патрэб і надзей. Рэалізм у жывапсіе дасягае свайго поўнага выражэння ў творчасці Ц. Бачкоўскага, Ю. Карчэўскага, К. Русецкага, К. Кукевіча, К. Альхімовіча, Н. Сільвановіча. У гэты перыяд найбольшае развіццё атрымалі такія жанры жывапісу, як гістарычны, бытавы, партрэт і пейзаж.

Такім чынам, крытычны рэалізм поруч з мастацкім метадам, стылёвым напрамкам, а таксама катэгорыяй вызначэння ступені адпаведнасці таго, што адлюстроўваецца ў літаратурна-мастацкіх творах, рэчаіснасці можна ахарактарызаваць яшчэ як парадыгму сацыякультурнага развіцця грамадства другой паловы XIX – пач. XX стст., абапіраючыся ў асноўным на выяўленне абумоўленасці культурнай сітуацыі тагачаснымі сацыяльнымі чыннікамі. Дадзены падыход дае выдатную магчамасць разгледзець у межах рэалістычнай парадыгмы культуратворчасці яе светапоглядны і аксіялагічны складнікі, якія заключаюцца ў акрэсліванні залежнасці жыцця асобнага чалавека ад стану ўсяго грамадства, ад сацыяльных умоў, якія непасрэдным чынам фарміруюць асобу, уплываюць на яе і фарміруюць яе каштоўнасныя арыентацыі, звязаныя найперш з імкненнем да сацыяльнай справядлівасці, да шчасця цэлага народа.

---


1. Бакач, Н. Б. Культурная парадигма как объект социально-философского анализа: автореф. дис. на соиск. учён. степ. кандидата философских наук / Н. Б. Бакач. – Волгоград, 1998. – 24 с.

2. Барысенка, В. В. Францішак Багушэвіч і праблемы рэалізму ў беларускай літаратуры XIX ст / В. В. Барысенка. – Мн. : Выдавецтва АН БССР, 1957. – 365 с.

3. Гуляев, Н. А. Литературные направления и методы в русской и зарубежной литературе XVII – XIX веков. / Н. А. Гуляев. – М. : Высш. школа, 1983. – 359 с.

4. Каратынскі, В. Творы / В. Каратынскі. – Мн. : Маст.літ, 1994. – 406 с.

5. Кун, Т. Структура научных революций / Т. Кун. – М. : Прогресс, 1977. – 300 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Углик, И. Г. Основные факторы историко-культурной динамики Беларуси // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества. – Мн. : Современное знание, 2010. – С. 139 – 141.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ